УДК 2

# УРАДЖЭНЦЫ БЕЛАРУСІ Ў КІЕВА-МАГІЛЯНСКАЙ АКАДЭМІІ Ў КАНЦЫ XVII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVIII ст.

**Самусік Андрэй Фёдаравіч,**
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*У артыкуле аналізуецца практыка паездак айчыннай праваслаўнай моладзі ў Кіева-Магілянскую акадэмію ў канцы XVII – першай палове XVIII ст. Прыведзены прозвішчы 18 асоб, якія атрымалі ў ёй адукацыю ў азначаны час. У дачыненні да 8 асоб прасочаны далейшы лёс і вызначаны іх уклад у развіццё Рускай праваслаўнай царквы. Адзначана, што большая частка, з выязджаючых на вучобу ў Кіеў назаўсёды пакідала сваю Радзіму.*

11 студзеня 1694 г. выйшла грамата цароў Іаана і Пятра Аляксеявічаў, згодна якой у Кіева-Магілянскую акадэмію дазвалялася прымаць студэнтаў не толькі з тэрыторыі Рускай дзяржавы, але і з-за яе межаў. Такім чынам быў ліквідаваны штучны разрыў вядучага тагачаснага цэнтра праваслаўнай асветы найперш з адзінаверцамі ў Рэчы Паспалітай, уведзены царом Аляксеям Міхайлавічам у 1666 г. [1, с. 194].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Аднаўленне асветных кантактаў з Кіевам спрыяла таму, што таленавітая праваслаўная моладзь з Беларусі зноў пачала атрымліваць якасную адукацыю. Вядома, што пасля 1697 г. у акадэмію быў залічаны шляхціч І. Рагалеўскі з Мінска. Пасля навучання ён вярнуўся ў родны горад, дзе служыў іерадыяканам у мясцовым Петрапаўлаўскім манастыры. У час Паўночнай вайны яго ўзяў да сабе духоўнікам фельдмаршал гр. Б. Шэрамец'еў. Потым ён суправаджаў рускае пасольства ў Персію, служыў абер-іераманахам на галеры "Пінск" на Чорным моры (абараняў Азоў). Вяршыняй жа царкоўнай кар'еры І. Рагалеўскага стала пасада архіепіскапа Чарнігаўскага і Ноўгарад-Северскага [2, с. 456].

Захавалася практыка паездак айчыннай моладзі ў Кіева-Магілянскую акадэмію і ў час Паўночнай вайны. Сярод іх вылучаюцца браты С., Г. і І. Канцэвічы з мяшчанскай сям'і Пінска. Першы з іх – Серапіён – у 1718 г. выкладаў у Кіеве лацінскую граматыку, а ў 1720 г. быў выкліканы Ф. Пракаповічам (займаў тады месца епіскапа Пскоўскага, Нарвскага і Ізборскага) у Пскоў для адкрыцця школы, але раптоўна памёр. Другі – Герман – у 1722 г. быў запрошаны на працу ў Маскоўскую славяна-грэка-лацінскую акадэмію, дзе выкладаў філасофію і багаслоўе, а ў 1728-1731 гг. займаў пасаду рэктара. Пасля гэтага яго прызначылі архіепіскапам Архангелагародскім і Халмагорскім. На новае месца працы ён адправіўся разам з братам Ігнаціям і менавіта яны пачалі выкладаць у Халмагорскай школе, з якой усяго за год да іх прыбыцця з'ехаў М. Ламаносаў. У 1735 г. Г. Канцэвіч памёр, а яго брат вярнуўся на Украіну і да сярэдзіны 1750-х гг. служыў ігуменам Кітаеўскай пустыні ў Кіеве [3, с. 278 ; 4, с. 278 ; 5, с. 278].

Масавы характар паездкі з Беларусі ў Кіеў набылі ў 1710–40-я гг., калі ў ВКЛ зніклі апошнія брацкія школы (Магілёў і Вільня). Нажаль, спецыфіка справаздач Кіева-Магілянскай акадэміі большасць часу не прадугледжвала збор інфармацыі аб "разночинцах и заграничных". Падобныя звесткі сістэматычна запісваліся толькі ў 1736-1737 і 1737-1738 навуч. гг. У гэты час не менш за 11 студэнтаў паходзілі з беларускіх зямель: А. Байкоўскі (сын "посполитых родителей" з Брэста; 1737-1738 навуч. г. клас граматыцы: "учения доброго"); Ф. Вербіцкі (са шляхты з Воршы; 1736-1737 і 1737-1738 навуч. гг. клас аналогіі: "учения прехудого" і "учения подлого" адпаведна); Т. Гарлянскі (з мяшчан з Пінску; 1736-1737 навуч. г. клас рыторыкі: "учения худого"); Г. Данілевіч (з мяшчан з Брэста; іерадыякан; 1736-1737 навуч. г. клас сінтаксіса: "учения доброго"); М. Іванецкі (сын святара з Хоцімска; 1737-1738 навуч. г. клас аналогіі: "учения мерного"); Р. Клянчынскі (з мяшчан з Высоцка пад Пінскам – мястэчка належыла Пінскаму езуіцкаму калегіўму); 1736-1737 навуч. г. клас інфімы: "учения мерного"); Й. Нарадоўскі (сын "посполитых родителей" з Дуброўны; 1736-1737 навуч. г. клас паэтыцы: "состояния доброго, в учении охочо прилежен"); І. Расінскі (сын "посполитых родителей" з Мінска; 1736-1737 навуч. г. клас паэтыцы: "постоянен, в учении надёжен"); Я. Ціхановіч (сын святара са Слуцка; 1736-1737 навуч. г. клас сінтаксіса: "учения доброго"; 1737-1738 навуч. г. клас паэтыцы: "учения мерного"); А. Шпакоўскі (сын "посполитых родителей" з Пінску; 1736-1737 навуч. г. клас сінтаксіса: "в учении добр"); Д. Якімовіч (сын святара з Давыд-Гарадка; 1736-1737 і 1737-1738 навуч. гг. клас філасофіі: "учения доброго") [6, с. 27, 33-34, 40, 43, 45, 47, 49, 56, 59, 65, 71, 77, 86-87]. Пра далейшы лёс вядома толькі ў дачыненні да Г. Данілевіча, які 17 жніўня 1744 г. быў прызначаны настаўнікам класа аналогіі (у гэты час яшчэ вывучаў багаслоўе) [7, с. 175].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Захаваліся і некаторыя іншыя прозвішчы айчынных ўраджэнцаў, якія ў азначаны перыяд вучыліся ў Кіеве. Так, 1720-я гг. у акадэміі займаўся К. Весялоўскі з купецкай сям'і з Магілёва. У 1730 г. ён пастрыгся ў манахі Кіева-Пячорскай лаўры (у 1733 г. – іерадыякан) [8, с. 112]. Адначасова з ім у 1727 г. у класе рыторыцы вучыўся А. Ванькоўскі, які паходзіў з мяшчанскай сям'і Заблудава пад Гродна. У пачатку 1730-х гг. ён пастрыгся ў манахі Кіева-Пячорскай лаўры (у 1735 г. – іерадыякан) і ў 1741 г. быў пераведзены ў Аляксандра-Неўскую лаўру ў Пецярбургу [9, с. 100]. У пачатку 1730-х гг. поўны курс Кіева-Магілянскай акадэміі скончыў А. Іляшэвіч, якога сучасныя ўкраінскія даследчыкі таксама лічаць беларусам па паходжанню. У 1734 г. ён выкладаў у школе згаданай Аляксандра-Неўскай лаўры, у 1740-я гг. кіраваў Маскоўскай Сінадальнай друкарняй, а ў далейшым стаў епіскапам Вяцкім і Вялікапермскім [10, с. 239-240].

У цэлым, прыведзеныя звесткі аб навучанні ўраджэнцаў Беларусі ў Кіеве сведчаць аб тым, што практыка іх паездак у тутэйшую акадэмію была шырока распаўсюджана. Нажаль, айчынныя праваслаўныя абшчыны не мелі ўласнага стыпендыяльнага фонду (у адрозненні ад езуітаў, уніятаў і кальвіністаў), а значыць – тыя, хто выязджаў за мяжу рабілі гэта за ўласны кошт і не неслі аніякіх абавязацельстваў па вяртанню да хаты і адпрацоўцы атрыманых грошаў на пасадах святароў ці настаўнікаў. Кіеў жа ў тыя часы з'яўляўся асноўнай крыніцай кадраў для ўсёй Рускай праваслаўнай царквы, а таму не залежна ад паходжання, фінансавага палажэння, стану здароўя і нават поспехаў у вучобе тут даволі проста можна было атрымаць накіраванне на спакойнае ды прыбытковае месца дзесьці на прасторах Расійскай імперыі. Як след гэтага – на Радзіму вярталіся толькі адзінкі, што спрыяла далейшаму заняпаду праваслаўнай царквы ў Беларусі.

## Літаратура


1. Самусік, А.Ф. Праваслаўная адукацыя на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVII ст. / А.Ф. Самусік // Научные труды Республиканского института высшей школы : сб. науч. ст. : в 3 ч. – Минск : РИВШ, 2020. – Ч. 2. – Вып. 20. – С. 193-201.
2. Жук, В.Н. Рогалевський, чернече ім'я Іларіон / В.Н. Жук, О.Ф. Задорожна, С.Р. Кагамлик // Києво-Могилянська академія в іменах, XVII-XVIII ст. – Київ : КМ Академія, 2001. – С. 456.
3. Андрушко, В.О. Концевич Серапіон / В.О. Андрушко // Києво-Могилянська академія в іменах, XVII-XVIII ст. – Київ : КМ Академія, 2001. – С. 278.
4. Андрушко, В.О. Концевич, чернече ім'я Герман / В.О. Андрушко, З.І. Хижняк // Києво-Могилянська академія в іменах, XVII-XVIII ст. – Київ : КМ Академія, 2001. – С. 278.
5. Кагамлик, С.Р. Концевич, чернече ім'я Ігнатій / С.Р. Кагамлик // Києво-Могилянська академія в іменах, XVII-XVIII ст. – Київ : КМ Академія, 2001. – С. 278.
6. Акты и документы, относящиеся к истории Киевской академии : в 2 отд., 10 т. – Киев, 1904-1916. – Отд. 2 (1721-1795). – Т. 1 : 1721-1750. – Ч. 2 Приложения. – Киев : Тип. И.И. Чоколова, 1904. – XXI, 508 с.
7. Степаненко, Н.В. Данилевич, чернече ім'я Гавриїл / Н.В. Степаненко // Києво-Могилянська академія в іменах, XVII-XVIII ст. – Київ : КМ Академія, 2001. – С. 175.
8. Кагамлик, С.Р. Веселовський, чернече ім'я Корнелій / С.Р. Кагамлик // Києво-Могилянська академія в іменах, XVII-XVIII ст. – Київ : КМ Академія, 2001. – С. 112.
9. Кагамлик, С.Р. Ваньковський Олександр, чернече ім'я Амос / С.Р. Кагамлик // Києво-Могилянська академія в іме-нах, XVII-XVIII ст. – Київ : КМ Академія, 2001. – С. 100.
10. Сандалюк, О.М. Іляшевич, чернече ім'я Антоній / О.М. Сандалюк // Києво-Могилянська академія в іменах, XVII-XVIII ст. – Київ : КМ Академія, 2001. – С. 239-240.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова